Установа адукацыі
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНАЛАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

Конкурс навукова-даследчых і творчыхработ студэнтаў
і магістрантаў па грамадскіх і гуманітарных навуках

*Знание — сила!*

# НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВАЯ БАЗА ВЫДАВЕЦКАЙ ГАЛІНЫ БЕЛАРУСІ, РАСІІ І УКРАІНЫ (1991–1995)

Тарасевіч Ксенія Тарасаўна,
1 курс, 4 група

Кулікові Уладзімір Іванавіч,
канд. філал. навук, дацэнт,
дацэнт кафедры РВТ

Мінск, 2014

# РЭФЕРАТ

**Ключавыя словы:** выдавецкая справа, заканадаўчы акт, закон, кнігавыданне, кнігараспаўсюджванне, нарматыўна-прававая база, пагадненне, пастанова, праграма развіцця кнігавыдання, указ.

Работа ўтрымлівае 33 старонкі. Яна складаецца з уводзінаў (с. 5–6), асноўнай часткі (с. 7–17), заключэння (с. 18–19), спісу літаратуры (с. 20–21), дадатку (с. 22–32).

Ва ўводзінах абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы, акрэсліваюцца мэта і задачы, метады, а таксама матэрыялы даследавання.

Першы параграф асноўнай часткі «Станаўленне нарматыўна-прававой базы выдавецкай справы ў Беларусі» прысвечаны разгляду асноўных заканадаўчых актаў, якія былі прыняты Вярхоўным Саветам і Саветам Міністраў РБ. Агульная колькасць такіх актаў — 10. Сярод іх 2 законы, 5 пастаноў, 2 міжнародныя пагадненні і рэкамендацыйны заканадаўчы акт, падпісаны сумесна з Расіяй.

У другім параграфе «Расійская нарматыўна-правававая база ў сферы кнгавыдання» разглядаюцца 16 заканадаўчых актаў, у якіх закранаюцца пытанні кнігавыдання і кнігараспаўсюджвання на тэрыторыі Расіі. Гэтыя дакументы былі прынятыя Урадам і Прэзідэнтам РФ. Сярод іх 6 законаў, 3 пастановы, 3 указы, 2 пагадненні, распараджэнне і згаданы вышэй рэкамендацыйны заканадаўчы акт, падпісаны сумесна з Беларуссю.

Трэці параграф мае назву «Станаўленне заканадаўчай базы выдавецкай справы Украіны». У ім аналізуюцца 75 заканадаўчых актаў, прынятых Прэзідэнтам, Вярхоўнай Радай, Кабінетам Міністраў Украіны, а таксама Дзржаўным мытным камітэтам і Галоўнай дзяржаўнай падатковай інспекцыяй. У ліку гэтых дакументаў 36 пастаноў, 9 указаў, 2 дэкларацыі, 3 распараджэнні, 5 законаў, 3 загады, 11 дамоў, 2 лісты, пагадненне, канвенцыя, растлумачэнне і праграма рэалізацыі папярэдняй дамовы.

У заключэнні падводзяцца вынікі праведзенага даследавання. Устаноўлена, што найбольш інтэнсіўна і плённа праца па стварэнні нарматыўна-прававой базы выдавецкай галіны ажыццяўлялася на Украіне.

Спіс літаратуры ўключае 16 пазіцый.

У дадатку змешчана табліца, якая мае назву «Пералік заканадаўчых актаў датычна кнігавыдання, прынятых у Расіі, Беларусі і Украіне ў 1991–1995 гг.»

# ВОДЗЫЎ

Апошняе дзесяцігоддзе XX ст. стала знакавым для многіх рэспублік СССР. З 1991 г. яны набылі дзяржаўную незалежнасць і сталі самастойнымі. Гэта ў сваю чаргу выклікала вострую неабходнасць стварэння нарматыўна-прававой базы функцыянавання ўсіх сфер грамадскага жыцця. Выдавецкая сфера — не выключэнне. Даследаванне развіцця гэтай сферы праз заканадаўчую базу на тэрыторыі усходнеславянскіх дзяржаў — адна з актуальных задач сучаснай навукі. Атрыманыя вынікі, упэўнены, дазволяць зразумець сутнасць інтэграцыйных працэсаў кнігавыдавецкай галіны многіх краін.

У навуковай працы К. Т. Тарасевіч сабрана і прааналізавана каля 100 асноўных законаў, указаў, пастаноў і распараджэнняў украінскіх, расійскіх і беларускіх заканатворцаў у перыяд з 1991 па 1995 гг. — першыя гады дзяржаўнай незалежнасці, калі фарміравалася сістэма нацыянальна арыентаванага кнігавыдання і кнігараспаўсюджвання.

Ва ўводзінах аўтар дакладна акрэслівае мэту, задачы даследавання і абгрунтоўвае актуальнасць вывучэння ўсходнеславянкага вопыту стварэння заканадаўчых актаў у выдавецкай галіне.

У асноўнай частцы падаюцца аналітычныя звесткі, а таксама прыводзяцца ў храналагічнай паслядоўнасці заканадаўчыя акты, што пацвярджаюць сутнасць тэарэтычных пастулатаў.

У заключэнні змяшчаюцца несупярэчлівыя, слушныя і абгрунтаваныя вывады адносна таго, як адбывалася станаўленне нарматыўна-прававой базы ў Расіі, Беларусі і Украіне. Устаноўлена, што ў гэты час Украіна стала першай усходнеславянскай дзяржавай, якая прыняла адмысловую Дзяржаўную праграму развіцця нацыянальнага кнігадрукавання на перыяд да 2000 года.

Змест навуковай працы сведчыць, што структура яе лагічная, фактычны матэрыял багаты і адпавядае рэальнасці. Грубых фактычных недакладнасцяў не выяўлена. Назва цалкам адпавядае зместу.

Лічу, што даследаванне К. Т. Тарасевіч «Нарматыўна-прававая база выдавецкай галіны Беларусі, Расіі і Украіны (1991–1995)» з’яўляецца актуальным, змяшчае новыя звесткі і можа быць рэкамендаваны да ўдзелу ў конкурсе навукова-даследчых работ студэнтаў і магістрантаў БДТУ.

Навуковы кіраўнік
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры РВТ У. І. Кулікoвіч

# ЗМЕСТ

Уводзіны ........ 5
Асноўная частка ........ 7
1. Станаўленне нарматыўна-прававой базы выдавецкай справы ў Беларусі .. 7
2. Расійская нарматыўна-правававая база ў сферы кнгавыдання ........ 9
3. Станаўленне заканадаўчай базы выдавецкай справы Украіны ........ 13
Заключэнне ........ 18
Літаратура ........ 20
Дадатак. Пералік заканадаўчых актаў датычна кнігавыдання, прынятых у Расіі, Беларусі і Украіне ў 1991–1995 гг. ........ 22

# УВОДЗІНЫ

Час з 1991 па 1995 гг. з'яўляўся важным перыядам у станаўленні выдавецкай справы Беларусі, Расіі і Украіны. Як сцвярджаюць нашы даследчыкі, гэта быў так званы перыяд дэцэнтралізацыі ў кніжнай галіне ўсходнеславянскіх краін, для якога характэрныя: 1) частковая адмена абавязковага тэматычнага планавання; 2) з'яўленне першых недзяржаўных выдавецтваў; 3) развіццё рыначных адносінаў у выдавецка-паліграфічным комплексе [Нічыпаровіч].

«Адмоўным бокам гэтага перыяду,— піша У. Касько,— трэба лічыць прыход у выдавецкую дзейнасць дылетантаў, якія вырашылі выкарыстаць зручны момант, каб нажыцца на кніжным дэфіцыце. Адсюль — шматлікія выпадкі выпуску безгустоўнай нізкапробнай літаратуры, частыя парушэнні аўтарскіх правоў. Адчуваецца адток прафесіяналаў-выдаўцоў, якія прывыклі працаваць над стварэннем сур'ёзнай літаратуры. Урэшце рэшт, на змену кароткаму ўзлёту "вольнага кнігавыдання" прыйшоў крызіс. Абывацель насыціўся "лёгкім чытвом", атрымаўшы вялікія грошы, многія дзялкі перавялі іх у іншыя сферы. Падаюць тыражы, даражэюць папера, паліграфічныя матэрыялы, маркетынгавыя паслугі» [Касько].

Працягнуўся спад вытворчасці, які быў характэрны для савецкага кнігавыдання канца 80-х гадоў. Адбылася змена прыярытэтаў дзейнасці з агульнасавецкіх, інтэрнацыянальных на нацыянальныя, якія выявіліся ў першую чаргу ў змяненні структуры кнігавыдання — памяншэнні долі рускамоўных кніг [Селіверстава, с. 97].

Завяршыўся распад адзінай сістэмы бібліятэчнай, выдавецкай справы і кнігазабеспячэння, у кожнай з краін пачалося стварэнне самастойных інфармацыйных сістэм [Зайцаў].

Гэты перыяд у станаўленні заканадаўчай базы выдавецкага комплексу Беларусі, Расіі і Украіны ў супастаўляльным плане яшчэ не быў аб'ектам спецыяльнага аналізу даследчыкаў. Маюцца толькі асобныя публікацыі, дзе закранаюцца некаторыя пытанні прававой базы кнігаабмену паміж Расіяй і краінамі СНД [Селіверстава, с. 147–156], публікацыі датычна станаўлення расійскай нарматыўна-прававой базы [Ленскі, Ільініцкі] і некаторых аспектаў развіцця інфармацыйнай прасторы Украіны [Сянчэнка]. Аднак усходнеславянскія краіны з'яўляюцца найбуйнейшымі вытворцамі кніг, вылучаюцца сваімі традыцыямі друкарства, корпусам аўтараў і наяўнасцю дастатковай колькасці высокакваліфікаваных рэдакцыйна-выдавецкіх кадраў [Селіверстава, с. 97]. Таму вывучэнне досведу стварэння заканадаўчай базы як важнага складніку развіцця галіны з'яўляецца актуальнай задачай для тэорыі і практыкі друкарскіх працэсаў на постсавецкай прасторы. Веданне дынамікі прыняцця заканадаўчых актаў у першыя гады незалежнасці трох краін, іх асэнсаванне, вызначэнне агульнага і адрознага ў шляхах станаўлення выдавецка-паліграфічнага комплексу дзяржаў паспрыяе плённаму ўзаемаабмену досведам, паскорыць развіццё кнігавыдання кожнага рэгіёна, а таксама дазволіць глыбей пазнаць: 1) нацыянальную спецыфіку станаўлення выдавецкай галіны ўсходнеславянскіх краін; 2) жанравы склад заканадаўчай

базы кожнай дзяржавы; 3) дзяржаўныя прыярытэты ў выдавецкай галіне трох краін; 4) шляхі інтэграцыі Беларусі са сваімі суседкамі.

Мэта даследавання — прааналізаваць нарматыўна-прававую базу выдавецкай галіны ўсходнеславянскіх краін з 1991 па 1995 гг.

Для дасягнення мэты стаавіліся і вырашаліся наступныя задачы:

— вывучыць асноўную навуковую літаратуру адносна заяўленай тэмы;

— прааналізаваць сацыяльна-эканамічную і палітычную сітуацыю на постсавецкай прасторы;

— выявіць асноўныя заканадаўчыя акты, якія былі прыняты ў Расіі, Беларусі і Украіне і ўстанавіць іх тыпалагічныя асаблівасці.

Матэрыялам даследавання паслужылі розныя па жанры заканадаўчыя акты Беларусі [ЮСИАС 7.0], Расіі [Зарубін, ГАРАНТ] і Украіны [МЕГА-НАУ], у якіх закранаюцца пытанні кнігавыдання і кнігараспаўсюджвання.

# АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

Як вядома, 12 чэрвеня 1991 г. З'езд народных дэпутатаў РСФСР прыняў дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце і ўстанавіў прыярытэт расійскіх законаў над саюзнымі. Праз два месяцы (25 жніўня) адбылося абвяшчэнне незалежнасці Беларусі. УССР стала суверэннай яшчэ 16 ліпеня 1990 г., а праз год (24 жніўня 1991 г.) быў прыняты Акт абвяшчэння незалежнасці Украіны, які 1 снежня 1991 г. падтрымаў народ на ўсеўкраінскім рэферэндуме [Незалежнасць]. Праз некалькі дзён пасля гэтага Белавежская дамова афіцыйна пацвердзіла распад СССР. Выдавецкая галіна, якая цэнтралізавана падпарадкоўвалася Міністэрству інфармацыі і друку СССР (былы Дзяржаўны камітэт па друку СССР), перастала быць агульнай для ўсіх краін постсавецкай прасторы, таму кожная з самастойных дзяржаў вымушана была ствараць заканадаўчую базу ў адпаведнасці са спецыфікай, эканамічнымі і палітычнымі фактарамі развіцця свайго рэгіёна.

## 1. Станаўленне нарматыўна-прававой базы выдавецкай справы ў Беларусі

Першыя гады незалежнасці Беларусі характарызаваліся звычайным для ўсіх краін постсавецкай прасторы зніжэннем колькасці выпуску кніг у параўнанні з савецкім перыядам. Аднак паступова тэндэнцыя росту паказчыкаў стварэння кніг па колькасці назваў становіцца ўстойлівай, і ўжо ў 1995 годзе (раней, чым у шматлікіх іншых былых савецкіх краінах) зафіксавана перавышэнне ўзроўня 1988 г. [Селіверстава, с. 118]

Сварэнне заканадаўчых актаў, накіраваных на развіццё выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці распачалося толькі праз два месяцы пасля абвяшчэння незалежнасці (кастрычнік 1991). У гэты час актуальнымі сталі пытанні фарміравання новых органаў улады, стварэння новай сістэмы рэгулявання выдавецкай галіны, развіцця нацыянальнай культуры і асветы краіны. Вялікая ўвага надавалася ліцэнзаванню асобных відаў дзейнасці, у тым ліку выдавецкай. Пра гэта сведчаць прынятыя ў канцы **1991 года** закон і пастанова:

— Пастанова Савета Міністраў РБ ад 16.10.91 г. № 386 «О порядке выдачи субъектам хозяйствования специальных разрешений (лицензий) на осуществление отдельных видов деятельности и государственной регистрации предпринимателей, осуществляющих свою деятельность без образования юридического лица», якая зацвярджала «Часовае палажэнне аб парадку выдачы суб'ектам гаспадарання спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) на здзяйсненне асобных відаў дзейнасці», дзе сярод іншых відаў дзейнасці названы, таксама, выдавецкая і паліграфічная;

— Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 кастрычніка 1991 г. № 1202–XII (Ведамасці Вярхоўнага Савета РБ, 1991 г., № 33, арт. 598) «Аб адукацыі», дзе фрагментарна прыгадваецца і выдавецкая справа. У артыкуле 5 «Мовы навучання і выхавання» гаворыцца: «Государство гарантирует гражданам право выбора языка обучения и воспитания и создаёт соответствующие условия для реализации этого права. Обучению на белорусском языке, изданию

литературы, учебников и учебных пособий на белорусском языке оказывается государственная поддержка». У артыкуле 54 «Матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў адукацыі» напісана: «Государство поддерживает и развивает издательскую, полиграфическую и учебно-производственную базу, обеспечивающую деятельность сферы образования».

Для нашых заканатворцаў **1992 г**. быў плённым. За гэты час былі прынятыя дзве важныя пастановы:

— Пастанова Савета Міністраў ад 6 мая 1992 г. № 256 «Об организации государственного управления сферой информации и книгоиздания, о структуре и штатах центрального аппарата Министерства информации»;

— Пастанова Савета Міністраў РБ ад 8 чэрвеня 1992 г. № 341 «Об утверждении положения о Министерстве информации РБ», у якой зацвярджаліся месца Міністэрства ў агульным дзяржаўным апараце як юрыдычнай асобы, палітыка і галоўныя задачы Міністэрства, дзеянні ў адпаведнасці з ускладзенымі абавязкамі і заканадаўствам, структура Міністэрства, а таксама абавязкі Міністра інфармацыі.

Такім чынам, можна канстатаваць, што з сярэдзіны 1992 г. у Беларусі быў створаны вышэйшы орган кіраўніцтва выдавецкай галіной, першаснымі задачамі якога сталі: 1) стварэнне і развіццё адзінай сістэмы інфармацыі, кнігавыдання і распаўсюджвання перыядычнага друку і прадукцыі ў рэспубліцы; 2) забеспячэнне дзяржаўных гарантый развіцця друку і іншых сродкаў масавай інфармацыі, выдавецкай дзейнасці і кантралявання выканання адпаведнага заканадаўства; 3) удзел у развіцці Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у РБ; 4) распрацоўка дзяржаўных праграм развіцця сродкаў масавай інфармацыі і кнігавыдання як важнай састаўной часткі беларускай нацыянальнай культуры, арганізацыя іх выканання; 5) устанаўленне сувязяў з адпаведнымі органамі краін СНД і іншых краін і рэалізацыя дамоваў і пагадненняў аб супрацоўніцтве ў сферы кнігавыдання і ў СМІ; 6) рэгістрацыя сродкаў масавай інфармацыі, выдача ліцэнзій на выдавецкую і паліграфічную дзейнасць; 7) ахова дзяржаўных таямніц у сродках масавай інфармацыі і некаторыя іншыя.

У **1993 г.** актуальнымі сталі пытанні развіцця міжнародных адносінаў у сферы кнігавыдання, у прыватнасці, аховы аўтарскага права. Вырашэнню гэтай задачы былі прысвечаныя наступныя акты:

— Пастанова Савета Міністраў РБ ад 7 чэрвеня 1993 г. № 370 «О правопреемственности РБ в отношении к подписанной 6 сентября 1952 г. в г. Женеве Всемирной конвенции об авторском праве»;

— Пагадненне аб супрацоўніцтве дзяржаў-удзельніц СНД у сферы аховы аўтарскага права і сумежных правоў, прынятае 24 верасня 1993 г.

Для Беларусі **1994 г.** стаў перыядам істотных палітычных зменаў: краіна набыла статус прэзідэнцкай рэспублікі. Заканадаўчыя акты, якія датычыліся выдавецкай справы, у гэтым годзе не былі створаны.

У **1995 годзе** вялікая ўвага звярталася на функцыянаванне СМІ і ліцэнзаванне асобных відаў дзейнасці. Працягнулася развіццё міжнародных адносінаў. Пра гэта сведчаць наступныя дакументы:

— Закон РБ № 3515–XII ад 13 студзеня 1995 г. (Ведамасці Вярхоўнага Савета РБ 1995 г., № 12, ст. 121) «О печати и других средствах массовой информации». Дакумент складаецца з 50 артыкулаў, 9 раздзелаў: 1) «Агульныя палажэнні»; 2) «Стварэнне і арганізацыя дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі»; 3) «Распаўсюджванне масавай інфармацыі»; 3.1) «Аб парадку асвятлення дзейнасці вышэйшых органаў дзяржаўнай улады ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі» (выключаны ў 1998 годзе); 4) «Адносіны сродкаў масавай інфармацыі з грамадзянамі, дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі»; 5) «Правы і абавязкі журналіста»; 6) «Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы масавай інфармацыі»; 7) «Адказнасць за парушэнне заканадаўства аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі»; 8) «Увядзенне дадзенага закона ў дзеянне»;

— Пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы кнігавыдання, кнігараспаўсюджвання і паліграфіі, падпісанае ўсімі краінамі СНД 10 лютага 1995 г. (дата ўступлення пагаднення ў сілу для Беларусі: 23.03.1995). Згодна з ім краіны абяцаюць развіваць узаемавыгаднае і раўнапраўнае супрацоўніцтва ў сферы кнігавыдання, кнігараспаўсюджвання і паліграфіі ў межах СНД, садзейнічаць рэалізацыі міжнароднай палітыкі падтрымкі кніжнай справы і фарміравання пазітыўнага грамадскага меркавання ў абарону кнігі, прыняць неабходныя захады, якія прадугледжваюць вызваленне выдаўцоў ад аплаты мытных збораў; абавязуюцца забяспечыць у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам свабодны абмен кніжнай прадукцыяй і выпуск у сваіх краінах друкаванай прадукцыі на мовах нацыянальных меншасцяў [Пагадненне];

— Пастанова Кабінета Міністраў РБ № 456 ад 12 жніўня 1995 г. «О перечне видов деятельности, на осуществление которых требуется специальное разрешение (лицензия), и органов, выдающих эти разрешения (лицензии)», дзе ўзгадваецца, таксама, выдавецкая справа;

— Рэкамендацыйны заканадаўчы акт Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў-удзельніц СНД «О единой политике в области обязательного экземпляра документов», прыняты 13 мая 1995 г. і падпісаны сумесна з Расіяй. У ім разглядаюцца мэты фарміравання сістэмы абавязковага асобніка, правы і абавязкі ствральнікаў (выдаўцоў), атрымальнікаў (бібліятэк, кніжных палат і інш.) і карыстальнікаў (чытачоў) дакументаў, якія рэкамендуюцца на ўключэнне ў склад абавязковага асобніка [Выдавецкая дзейнасць].

## 2. Расійская нарматыўна-праававая база ў сферы кнгавыдання

Пасля распаду СССР у Расіі працягнуўся спад кнігавыдання. Пачатак 90-х гадоў звязаны з пашырэннем заканадаўчых асноваў кнігавыдання [Селіверстава, с. 97–98], якое распачалося яшчэ да абвяшчэння незалежнасці і адбывалася наступным чынам.

У **1991 годзе** перад галіной паўсталі пытанні стварэння новага дзяржаўнага выдавецка-паліграфічнага комплексу і адпаведных органаў кіравання. Вырашэнню гэтых задач спрыялі наступныя акты:

— Пастанова СМ РСФСР ад 17 красавіка 1991 г. № 211 «О регулировании издательской деятельности в РСФСР», дзе 1) было зацверджана «Часовае палажэнне аб выдавецкай дзейнасці», што рэгулявала парадак выдавецкай дзейнасці на тэрыторыі РСФСР да прыняцця спецыяльнага Закона аб выдавецкай дзейнасці; 2) акрэслены агульныя пастулаты: свабода выдавецкай дзейнасці і недапушчальнасць цэнзуры; асноўныя тэрміны і паняцці (выдавецкая дзейнасць, друкаванае выданне, выдавецтва і інш.); правы на выдавецкую дзейнасць; межы выкарыстання выдавецкай дзейнасці; парадак заснавання выдавецтва, асаблівасці рэгістрацыі, правы і абавязкі выдавецтва; неабходнасць заключэння дамовы выдавецтва з аўтарам; 3) было даручана Міністэрству друку і масавай камунікацыі РСФСР весці Адзіны рэспубліканскі рэестр выдавецтваў, пачаць распрацоўку парадку адкрыцця і функцыянавання паліграфічных прадпрыемстваў і размнажальных участкаў («множительных участков»);

— Указ Прэзідэнта РСФСР «О реорганизации центральных органов государственного управления РСФСР» (от 28 ноября 1991 г. № 242), які, фактычна, зацвердзіў стварэнне Міністэрства друку і інфармацыі РСФСР;

— Закон «О средствах массовой информации» (ад 27 снежня 1991 г. № 2124–I), першы на постсавецкай прасторы дакументам такога кшталту. Структура закона: 62 артыкулы, 7 глаў: 1) «Агульныя палажэнні»; 2) «Арганізацыя дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі»; 3) «Распаўсюджванне масавай інфармацыі»; 4) «Адносіны сродкаў масавай інфармацыі з грамадзянамі і арганізацыямі»; 5) «Правы і абавязкі журналіста»; 6) «Міждзяржаўнае супрацоўніцтва ў сферы масавай інфармацыі»; 7) «Адказнасць за парушэнне заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі».

Адмоўны вынік эканамічных рэформаў, раптоўнае зніжэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва Расійскай Федэрацыі, супрацьстаянне прэзідэнцкай і парламенцкай улад — усё гэта паўплывала на запаволенне развіцця заканадаўчай базы. У **1992 г.** заканадаўчыя акты, якія датычыліся выдавецкай справы, створаны не былі.

У **1993 годзе** вялікая ўвага надзялялася развіццю міжнародных адносінаў, асабліва ў сферы аўтарскага права, а таксама ўдасканаленню дзяржаўнай сістэмы кіравання выдавецкай галіной. Вырашэнню гэтых пытанняў былі прысвечаны наступныя заканадаўчыя акты:

— Закон РФ ад 9 ліпеня 1993 г. № 5351–I «Об авторском праве и смежных правах», які складаўся з 53 артыкулаў і 5 раздзелаў;

— Пагадненне аб супрацоўніцтве дзяржаў-удзельніц СНД у сферы аховы аўтарскага права і сумежных правоў, прынятае 24 верасня 1993 г., згодна з якім дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць на сваіх тэрыторыях выкананне міжнародных абавязкаў, якія засталіся пасля распаду СССР (краіны-ўдзельніцы Сусветнай канвенцыі аб аўтарскім праве) і прымяняюць канвенцыю ў адносінах паміж сабой

як да твораў, створаных пасля 27 мая 1973 года, так і да твораў, якія ахоўваліся дзяржавай-удзельніцай да гэтай даты, на агульных умовах; абавязуюцца прыняць неабходныя меры для распрацоўкі і прыняцця законапраектаў, якія забяспечаць ахову аўтарскага права і сумежных правоў на ўзроўні патрабаванняў міжнародных канвенцый і пагадненняў; будуць праводзіць сумесную працу па барацьбе з незаконным выкарыстаннем аб'ектаў аўтарскага права і сумежных правоў; створаць нацыянальныя аўтарска-прававыя арганізацыі і будуць дапамагаць іх функцыянаванню; прадугледзяць вырашэнне пытанняў аб адхіленні падвойнага падаткаабкладання аўтарскай і іншай узнагароды;

— Указ Прэзідэнта РФ ад 7 кастрычніка 1993 г. № 1607 «О государственной политике в области охраны авторского права и смежных прав», у 4-ым пункце якога адзначалася: «Министерству иностранных дел Российской Федерации совместно с заинтересованными ведомствами и РАО в трёхмесячный срок внести предложения по присоединению Российской Федерации к Бернской конвенции об охране литературных и художественных произведений (в редакции 1971 г.), Всемирной конвенции об авторском праве (в редакции 1971 г.), Международной конвенции об охране интересов артистов-исполнителей, производительных фонограмм и вещательных организаций 1961 г., Конвенции по охране интересов производителей фонограмм от незаконного воспроизводства их фонограмм 1971 г., а также Многосторонней конвенции об избежании двойного налогообложения выплат авторского вознаграждения 1979 г»;

— Указ Прэзідэнта РФ ад 22 снежня 1993 г. № 2255 «О совершенствовании государственного управления в сфере массовой информации», які прадугледжваў ліквідацыю Міністэрства друку і інфармацыі Расійскай Федэрацыі і стварэнне Камітэта РФ па друку.

Для Расійскай Федэрацыі **1994 г.** стаў годам далучэння краіны да розных міжнародных пагадненняў у адпаведнасці з Распараджэннем Прэзідэнта РФ ад 25 сакавіка 1994 г. «Вопросы присоединения Российской Федерации к ряду международных конвенций в области авторского права». Была вызначана палітыка дзяржавы ў галіне фарміравання абавязковага асобніка дакументаў як рэсурснай базы камплектавання поўнага нацыянальнага бібліятэчна-інфармацыйнага фонда дакументаў РФ і развіцця сістэмы дзяржаўнай бібліяграфіі. Былі прыняты наступныя дакументы:

— Пастанова Урада РФ «О присоединении Российской Федерации к соглашению о ввозе материалов образовательного, научного и культурного характера и протоколу к нему» ад 6 ліпеня 1994 г. № 795 [Зарубін 1];

— Пастанова Урада РФ № 1224 ад 3 лістапада 1994 г. «О присоединении Российской Федерации к Бернской конвенции об охране литературных и художественных произведений в редакции 1971 года, Всемирной конвенции об авторском праве в редакции 1971 года и Дополнительным протоколам 1 и 2, Конвенции 1971 года об охране интересов производителей фонограмм от незаконного воспроизводства их фонограмм»;

— Федэральны закон ад 29 снежня 1994 г. № 77–ФЗ «Об обязательном экземпляре документов». Гэты закон прадугледжвае забеспячэнне захавання абавязковага асобніка, яго грамадскае выкарыстанне; уводзіць тыпы абавязковага асобніка дакументаў; распаўсюджваецца на дакументы, якія ўтрымліваюць асабістую і (ці) сямейную таямніцу, дакументы з дзяржаўнай, службовай ці камерцыйнай таямніцай, адзінкавыя дакументы, архіўныя дакументы (за выключэннем дакументаў, якія перадаюцца на захаванне ў архіўныя ўстановы ў адпаведнасці з артыкуламі 12, 18 і 19 Фэдэральнага закона), электронныя дакументы, якія распаўсюджваюцца выключна ў рэжыме сеткі, тэхнічную дакументацыю (фармуляры, інструкцыі па эксплуатацыі і інш.).

У **1995 годзе** прынятыя нарматыўна-прававыя акты былі прысвечаны развіццю і ахове інфармацыйнай сістэмы краіны, эканамічнаму станаўленню галіны, міжнароднаму супрацоўніцтву. Вось гэтыя дакументы:

— Федэральны закон № 24–ФЗ ад 20 лютага 1995 г. «Об информации, информатизации и защите информации», які складаецца з 25 артыкулаў, аб'яднаных у наступныя главы: 1) «Агульныя палажэнні»; 2) «Інфармацыйныя рэсурсы»; 3) «Карыстанне інфармацыйнымі рэсурсамі»; 4) «Інфарматызацыя, інфармацыйныя сістэмы, тэхналогіі і сродкі іх забеспячэння»; 5) «Абарона інфармацыі і правоў суб'ектаў у сферы інфармацыйных працэсаў і інфарматызацыі»;

— Пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы кнігавыдання, кнігараспаўсюджвання і паліграфіі, падпісанае ўсімі краінамі СНД 10 лютага 1995 г. (дата ўступлення ў сілу для Расіі: 19.07.1995);

— Рэкамендацыйны заканадаўчы акт Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў-удзельніц СНД «О единой политике в области обязательного экземпляра документов», прыняты пастановай Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў-удзельніц СНД 13 мая 1995 г.;

— Федэральны закон ад 24 лістапада 1995 года № 177–ФЗ «Об экономической поддержке районных (городских) газет», дзе былі дадзены азначэнні тэрмінам раённая (гарадская) газета і федэральны рэестр раённых (гарадскіх) газет; акрэслены змест эканамічнай падтрымкі раённых (гарадскіх) газет, прынцыпы фарміравання федэральнага рэестра раённых (гарадскіх) газет, умовы ўключэння ў Рэестр раённай (гарадской) газеты, парадак фінансавання раённых (гарадскіх) газет, адказнасць за парушэнне закона.

— Федэральны закон ад 1 снежня 1995 г. № 191–ФЗ «О государственной поддержке средств массовой информации и книгоиздания Российской Федерации», які складаўся з 11 артыкулаў, аб'яднаных у 4 главы: 1) «Агульныя паняцці»; 2) «Падаткавае, мытнае, валютнае і іншае фінансавае рэгуляванне»; 3) «Асаблівасці прыватызацыі прадпрыемстваў, якія забяспечваюць выпуск газетнай, часопіснай і кніжнай прадукцыі»; 4) «Аб парадку ўступлення сапраўднага Федэральнага закона ў сілу».

### 3. Станаўленне заканадаўчай базы выдавецкай справы Украіны

Пасля распаду СССР, незважаючы на раптоўнае павелічэнне колькасці выдавецтваў і выдавецкіх арганізацый, нейкі час працягваўся спад аб'ёмаў вытворчасці друкаванай прадукцыі, усё больш дэфармавалася якасная структура кнігавыдання. Значна скараціўся выпуск кніг прыярытэтнай сацыяльнай ды культурна-асветніцкай значнасці, быў зменшаны выпуск твораў сучасных украінскіх аўтараў, кніг украінскай і замежнай класікі, крытычная сітуацыя склалася з выпускам падручнікаў для школ, іншых сфер асветы. Зацверджаныя ў дадзены перыяд дакументы былі прысвечаны важным для ўкраінскай выдавецкай галіны пытанням стварэння нацыянальнай заканадаўчай, нарматыўна-тэхнічнай базы, удасканалення механізму абмену друкаванымі выданнямі з замежнымі краінамі, пашырэнне ўдзелу айчыннага кнігавыдання і друку ў міжнародным супрацоўніцтве [Праграма].

Украінскія заканадаўчыя акты **1991 г.** можна падзяліць на дзве групы: прынятыя да абвяшчэння незалежнасці і пасля абвяшчэння незалежнасці. Да першай групы адносяцца ўказы і пастановы, дзе акцэнтуецца ўвага на ўзнагародах лепшых працаўнікоў паліграфічных прадпрыемстваў, развіцці ўкраінскай і іншых нацыянальных моў і культуры на тэрыторыі Украіны, статусе асобных цэнтральных газет. Вось гэтыя дакументы:

— Указы Прэзідыі Вярхоўнай Рады УРСР: «Про відзначення працівників поліграфічних підприємств державними нагородами Української РСР» (29.01.1991), «Про присвоєння працівникам республіканських видавництв, м. Київ, почесного звання "Заслужений працівник культури Української РСР"» (18.02.1991);

— Пастанова Рады Міністраў УРСР № 41 ад 12.02.1991 «Про Державну програму розвитку української мови та інших національних мов в Українській РСР на період до 2000 року»;

— Пастанова Вярхоўнай Рады УССР ад 22.02.1991 г. «Про інформацію Комісії Верховної Ради Української РСР з питань культури та духовного відродження. Про стан роботи органів державного управління по створенню умов для розвитку культур національних меншин України»;

— Пастанова № 844–XII ад 18.03.1991 «Про статут редакції газети Верховної Ради Української РСР "Голос України"».

Пасля абвяшчэння незалежнасці асобая ўвага была звернута на стварэнне новай сістэмы рэгулявання выдавецкай галіны, выданню асобных кніг, развіццю нацыянальных культур. У гэты час з'явіліся наступныя дакументы:

— Пастанова Вярхоўнай Рады Украіны ад 09.10.1991 г. «Про позицію преси, телебачення і радіо України під час державного перевороту та заходи, що випливають з цього»;

— Распараджэнне Старшыні Вярхоўнай Рады Украіны ад 10.10.1991 «Про передачу власності, що належала ЦК Компартії України та КПРС»;

— Пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 16.10.1991 г. «Про додаткові заходи щодо забезпечення видання Книги Пам'яті» («З мэтай актывізацыі працы па ўвекавечанні памяці савецкіх грамадзян, якія загінулі пры абароне

Радзімы ў перадваенныя гады і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, а таксама пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку»);

— Дэкларацыя Вярхоўнай Рады Украіны ад 01.11.1991 «Декларація прав національностей України» (у ёй усім нацыянальнасцям гарантавалася права стварэння сваіх культурных цэнтраў, нацыянальных газет, часопісаў, выдавецтваў);

— Пастанова Кабінету Міністраў Украіны ад 27.11.1991 «Про передачу колишніх партійних видавництв у відання Державного комітету України по пресі».

**У 1992 г.** працягнулася фарміраванне органаў кіравання выдавецкай галіной, эканамічнае рэгуляванне сферы, з'явіліся першыя спецыяльныя заканадаўчыя акты, а таксама раней, чым у Расіі і Беларусі звернута ўвага на пытанні правапісу, выданне асобных кніг і развіццё міжнародных адносінаў у выдавецкай галіне. За гэты час былі прыняты наступныя дакументы:

— Пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 03.01.1992 г. «Про затвердження Положення про Головне управління по охороні державних таємниць у пресі та інших засобах масової інформації при Кабінеті Міністрів України»;

— Закон Вярхоўнай Рады Украіны ад 05.02.1992 г. «Про Єдиний митний тариф»;

— Указ Прэзідэнта Украіны ад 06.02.1992 «Про невідкладні заходи щодо соціального захисту діячів літератури і мистецтва в умовах переходу до ринкових відносин»;

— Пастановы Кабінета Міністраў Украіны ад 03.03.1992 г. і 25.05.1992 г. «Про розміри відрахувань до фондів творчих спілок України за використання творів літератури та мистецтва» і «Про авторську винагороду за видання, публічне виконання та інші види використання творів науки, літератури і мистецтва»;

— Пастановы Кабінета Міністраў Украіны ад 14.03.1992, 11.09.1992 і 16.09.1992 «Про додаткові заходи щодо забезпечення видання томів Зводу пам'яток історії та культури України», «Про підготовку і випуск серії книг "Реабілітовані історією"» і «Про заходи щодо видання Книги Пам'яті України»;

— Загад № 1–45–40/24, 19.03.1992 «Питання оформлення друкованих видань»;

— Пастанова Прэзідыі Вярхоўнай Рады Украіны ад 30.04.1992 «Про статут редакції журналу Верховної Ради України "Віче"»;

— Пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 08.06.1992 «Питання українського правопису», згодна з якой новая рэдакцыя правапісу ўводзілася ва ўсе сферы дзейнасці, у тым ліку, у выдавецкую справу;

— Пастановы Кабінета Міністраў ад 6.07.1992, 01.08.1992 і 15.08.1992 «Про впорядкування розсилки контрольних примірників творів друку», «Питання Державного комітету України по пресі» (Зацверджанне Палажэння аб Дзяржаўным камітэце Украіны па прэсе);

— Пастанова Кабінета Міністраў ад 15.08.1992 «Про спеціалізовані редакції для випуску літератури мовами національних меншин України»;

— Загад Міністэрства статыстыкі Украіны ад 11.09.1992 «Про затвердження форми державної статистичної звітності для видавництв і видавничих організацій»;

— Дамова аб супрацоўніцтве паміж Украінай і Французскай Рэспублікай (дамова ратыфікаваня Пастановаю ВР ад 17.09.1992);

— Закон Украіны «Про інформацію» (уводзіцца ў дзеянне Пастановай Вярхоўнай Рады ад 02.10.1992);

— Распараджэнне Кабінета Міністраў Украіны ад 20.10.1992 «Про створення сектору видавництв, поліграфії, засобів масової інформації та видання Книги Пам'яті України»;

— Пастанова Кабінета Міністраў ад 10.11.1992 г. «Про зміни в системі органів державної виконавчої влади, підвідомчих Кабінету Міністрів України»;

— Закон Украіны «Про друковані засоби масової інформації (пресу) в Україні» (уводзіцца ў дзеянне Пастановай ВР ад 16.11.1992).

У **1993 г.** актыўна праходзіла эканамічнае станаўленне выдавецкай галіны, фарміраванне органаў кіравання, развіццё міжнародных адносінаў у паліграфічнай сферы. Шмат увагі надзялялася рэгістрацыі друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, ахове дзяржаўных таямніц у СМІ, развіццю асветы. У гэтым годзе былі прынятыя:

— Пастановы Прэзідыі Вярхоўнай Рады Украіны ад 05.01.1993 і 20.12.1993 «Про матеріально-технічне забезпечення роботи журналу “Віче” в 1993 році» і «Про матеріально-технічне забезпечення роботи газети “Голос України” в 1994 році»;

— Пагадненне паміж Урадам Украіны і Урадам ФРГ пра культурнае супрацоўніцтва ад 15.02.1993;

— Пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 15.03.1993 «Про державну підтримку творчих спілок, преси та книговидавничої справи»;

— Пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 19.05.1993 аб утварэнні Дзяржаўнага камітэту Украіны ў справах выдавецтваў, паліграфіі і кнігараспаўсюджвання;

— Пастановы Кабінета Міністраў Украіны ад 28.05.1993 і 05.07.1993 «Про деякі питання охорони державних теємниць у пресі та інших засобах масової інформації» і «Про затвердження Положення про Державний комітет України по охороні державних таємниць у пресі та інших засобах масової інформації»;

— Пастановы Кабінета Міністраў «Про призначення Дяченка Ю. П. головою Державного комітету України у справах видавництв, поліграфії та книгорозповсюдження» ад 22.06.1993 і «Про заступників голови Державного комітету у справах видавництв, поліграфії та книгорозповсюдження» ад 18.09.1993;

— Разпараджэнне Прэзідэнта Украіны ад 30.07.1993 «Про заходи щодо державної підтримки преси»;

— Пастанова Кабінета Міністраў ад 10.08.1993 «Питання державної реєстрації друкованих засобів масової інформації»;

— Загад Міністэрства інфармацыі Украіны 16.08.1993 «Про державну реєстрацію друкованих засобів масової інформації»;

— Пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 03.11.1993 г. «Про Державну національну програму “Освіта” (“Україна XXI століття”)»;

— «Декларація про принципи відносин дружби і співробітництва між Україною і Туніською Республікою» ад 7.12.1993;

— Закон Вярхоўнай Рады Украіны ад 23.12.1993 «Про авторське право і суміжні права» (другі пасля Расіі закон такога кшталту).

У **1994 г.** працягнулася фарміраванне органаў кіравання выдавецкай галіной, развіццё міжнароднага супрацоўніцтва, вырашэнне пытанняў адносна аховы дзяржаўных таямніц у СМІ. Шмат увагі адводзілася пытанням дзяржаўнай падтрымкі СМІ. За гэты перыяд былі прынятыя наступныя дакументы:

— Пастанова ад 28.01.1994 № 40 «Про призначення Клименка А. П. заступником голови Державного Комітету України у справах видавництв, поліграфії та книгорозповсюдження»;

— «Угода між Міністерством зв’язку України і Міністерством зв’язку і інформатики Республіки Бєларусь про співробітництво з питань розповсюдження періодичних видань» ад 02.02.1994;

— «Чорноморська конвенція про співробітництво у галузі культури, освіти, науки та інформації» (дата ратыфікацыі: 04.02.1994, дата ўступлення ў сілу для Украіны: 30.10.1994);

— Пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 29.03.1994 «Про членів колегії Державного комітету у справах видавництв, поліграфії та книгорозповсюдження»;

— Указ Прэзідэнта Украіны ад 14.04.1994 «Про присвоєння рангів державних службовців»;

— Пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 29.04.1994 «Про затвердження Положення про порядок і механізм формування та опублікування Зводу відомостей, що становлять державну таємницю»;

